Г. Х. Андерсена, «Морозко», «Лиса и журавль» у главных героев возникает этический вопрос: выбор между своим комфортом и помощью другим [2].

Чтобы проверить, каким образом художественная литература влияет на развитие эмпатии, нами было проведено исследование в рамках научно-исследовательской работы. Для диагностики уровня эмпатии использовали методику «Неоконченные рассказы» Т. П. Гаврилиной [1]. Проведенная диагностика с детьми шестого года жизни позволила выявить следующие результаты: 31 % дошкольников показали гуманистический характер эмпатии, у 69 % был выявлен эгоцентрический характер эмпатии.

Далее на протяжении двух недель на занятиях по развитию речи в течение 25–30 минут осуществлялось вхождение в сказку; чтение сказок; обсуждение с воспитанниками сюжетов; использование продуктивных видов деятельности (рисование, лепка, драматизация); в заключение проводилось своеобразное действо выхода из сказки.

Для определения динамики и уровня эмпатии детей было проведено контрольное исследование. Результаты показали положительную динамику: эгоцентрический характер эмпатии наблюдался у 24 % дошкольников, а гуманистический характер эмпатии продемонстрировали 76 % детей. Также наблюдения за детьми позволили сделать вывод о том, что дошкольники стали внимательнее относиться к сверстникам, обращать внимание на свои эмоции, доброжелательнее общаться друг с другом.

Анализируя поведение героев из сказок, ребенок начнет следовать их примеру сначала ради одобрения взрослых. Постепенно забота об окружающих и сопереживание превратятся в привычку и станут неотъемлемой частью жизни. Таким образом, в сказках ребенок может найти для себя нравственные ориентиры, поэтому использование художественной литературы в развитии эмпатии играет огромную роль.

Список использованной литературы

1. Диагностика речевого развития детей дошкольного возраста : учеб. пособие / Л. В. Градусова, Н. И. Левшина, И. С. Дементьева. – Магнитогорск : Магнитогорский гос. ун-т, 2010. – 95 с.

2. Левшина, Н. И. Развитие языковой способности дошкольников / Н. И. Левшина // Дошкольная педагогика. – 2015. – № 3. – С. 10–12.

3. Стрелкова, Л. Творческое воображение: эмоции и ребенок / Л. Стрелкова // Обруч. – 1996. – № 4. – С. 24–26.

МГПУ им. И. П. Шамякина

## РЭПРАДУКЦЫІ КАРЦІН НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў 2 КЛАСЕ І ІХ РОЛЯ Ў РАЗВІЦЦІ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ВУЧНЯЎ

**Богдан Анастасія (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – Б. А. Крук, канд. філал. навук, дацэнт**

Сучаснаму ўроку літаратурнага чытання неабходны новыя формы і метады навучання, якія, абапіраючыся на літаратурныя творы, дапамагаюць настаўніку выхаваць высокадухоўную, маральную асобу.

У многім, як паказваюць назіранні, гэтаму садзейнічае выкарыстанне рэпрадукцый карцін на ўроках літаратурнага чытання. Урокі, дзе літаратурнае чытанне ўзаемазвязана з жывапісам, развіваюць маральную культуру, творчыя здольнасці навучэнцаў. Яны фарміруюць цікавасць дзяцей да мастацтва ў цэлым. Вучні становяцца больш самастойнымі ў сваіх меркаваннях, маюць свой пункт гледжання, як адзначае Т. С. Камарова, і ўмеюць аргументавана яго адстойваць [1].

Асноўная мэта выкарыстання рэпрадукцый карцін – палепшыць разуменне навучэнцамі тэкстаў, якія яны чытаюць. Пры выкарыстанні рэпрадукцый карцін на ўроку літаратурнага чытання важна памятаць аб некалькіх ключавых момантах. Па-першае, важна выбіраць карціны, якія адпавядаюць узросту і маюць непасрэднае дачыненне да тэкстаў, якія вывучаюцца. Напрыклад, калі навучэнцы чытаюць апавяданне пра жывёл, карысна абраць карціны, на якіх жывёлы падаюцца рэалістычна. Па-другое, важна дапамагчы навучэнцам зразумець, як карціна звязана з тэкстам, які вывучаецца. Гэта могуць быць пытанні на абмеркаванне стылю мастака, гістарычнага кантэксту, у якім была створана карціна. Па-трэцяе, важна, каб вучні асэнсавана ўзаемадзейнічалі з карцінамі. Для гэтага настаўнік можа выкарыстоўваць адкрытыя пытанні, дапамагаць устанаўліваць сувязі паміж карцінай і тэкстам. Уключэнне рэпрадукцый карцін ва ўрокі літаратурнага чытання можа быць практычным і эфектыўным спосабам палепшыць разуменне навучэнцамі твораў, якія яны чытаюць, і забяспечыць іх творчае развіццё.

У вучэбным дапаможніку па літаратурным чытанні для 2 класса [2] устаноў адукацыі з рускай мовай навучання пададзена 5 рэпрадукцый карцін: Станіслава Жукоўскага “Восень у сядзібе”, Кастуся Качана “Позняй восенню”, Івана Шышкіна “Жыта”, Мікалая Ісаёнка “Беларускі прастор”, Мікалая Багданава-Бельскага “Дзеці ў хаце”. Гэтыя рэпрадукцыі карцін лёгка суадносіць са зместам усяго літаратурнага твора ці з асобнымі яго эпізодамі.

Разглядаючы, напрыклад, карціны Станіслава Жукоўскага “Восень у сядзібе” і Кастуся Качана “Позняй восенню”, настаўнік прапануе для адказу наступныя пытанні: Якая пара года намалявана на першай карціне? *(На першай карціне намалявана восень).* Якая гэта восень? *(Гэта ранняя восень).* Як вы зразумелі, што гэта ранняя восень? *(На дрэвах з’явілася чырвонае і жоўтае лісце; неба светлае, блакітнае; яшчэ растуць кветкі).* Якая пара года намалявана на другой карціне? *(На другой карціне таксама намалявана восень).* Ці адрозніваюцца гэтыя карціны паміж сабой? Чым? *(Так, яны адрозніваюцца. На другой карціне прадстаўлена позняя восень).* Як вы зразумелі, што гэта позняя восень? *(На дрэвах няма лісця; неба зацягнулі шэрыя хмары; ідуць дажджы).* Якія пачуцці выклікаюць у вас гэтыя карціны? Чаму? *(Мне спадабаліся гэтыя карціны. На адной з іх прырода яшчэ не зусім развіталася з летам, а на другой ужо падрыхтавалася сустракаць зіму. Карціны зачароўваюць сваёй прыгажосцю).*



МГПУ им. И. П. Шамякина

Увага да карцін садзейнічае выхаванню мастацкага густу, развівае мастацкае пачуццё дзіцяці, дапамагае яму не толькі асэнсаваць, усвядоміць прачытанае, але і ўбачыць свет вачыма мастака і адчуць яго.

Намі праведзена эксперыментальная работа па выяўленні ўзроўню ўспрымання мастацкага твора малодшымі школьнікамі ў працэсе выкарыстання рэпрадукцый карцін на ўроках літаратурнага чытання. Згодна з методыкай дыягностыкі для дзяцей малодшага школьнага ўзросту харак тэрны чатыры ўзроўні ўспрымання мастацкага твора: фрагментарны ўзровень (менш за 5 балаў), канстатуючы ўзровень (5–6 балаў), узровень "Героя" (7–8 балаў), узровень "Ідэі" (9–11 балаў). На аснове параўнання вынікаў дыягностыкі на канстатуючым і кантрольным этапах эксперыментальнай работы вызначана, што ў 2 "Г" класе ўзровень "Ідэі" павысіўся з 16 % да 23 % (дынаміка складае 7 %). Узровень "Героя" таксама павысіўся з 32 % да 45 % (данаміка складае 13 %). А канстатуючы і фрагментарны ўзроўні ўспрымання мастацкага твора панізіліся адпаведна з 32 % да 26 % (6 %) і з 19 % да 6 % (13 %).

Выкарыстанне рэпрадукцый карцін на ўроках літаратурнага чытання з'яўляецца каштоўным інструментам для настаўнікаў, якія імкнуцца павысіць творчы патэнцыял сваіх вучняў, вучаць іх глыбей разумець літаратуру і мастацтва. Галоўнай мэтай урокаў літаратурнага чытання ў 2 класе з'яўляецца выхаванне актыўнага, свядомага чытача. Выкарыстанне рэпрадукцый карцін у сувязі з гэтым – важнейшы сродак, які спрыяе дасягненню гэтай мэты і вядзе да глыбейшага і больш поўнага ўспрымання зместу і вобразаў мастацкага твора малодшымі школьнікамі.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Комарова, Т. С. Красота. Радость. Творчество : Программа эстетического воспитания детей 8–11 лет / Т. С. Комарова, А. В. Антонова, М. Б. Зацепина. – М. : Педагогическое общество России, 2000. – 67 с.

2. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне : вуч. дапаможнік для 2 класа ўстаноў агул. сяр. адукацыі з рускай мовай навучання / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – Ч. 1. – 136 с.

## ОБОГАЩЕНИЕ ВЫРАЗИТЕЛЬНОГО ОБРАЗА В РИСОВАНИИ НА ОСНОВЕ ОЗНАКОМЛЕНИЯ ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА С ПРОИЗВЕДЕНИЯМИ П. И. ЧАЙКОВСКОГО

**Богданова Екатерина (ФГБОУ ВО ГГПИ им. В. Г. Короленко, Россия)**
**Научный руководитель – Е. В. Новикова**

Н. А. Ветлугиной было выдвинуто следующее определение: «Детский выразительный образ – это процесс переживания ребенком своего замысла и выражение своего нравственно-эстетического отношения к нему доступными средствами выразительности» [1]. О взаимосвязи художественно-выразительных образов в изобразительном и музыкальном искусстве писали многие авторы. Так Д. Б. Кабалевский говорил о необходимости

МГПУ им. И. П. Шамякина